жыхароў, лепшымі песенніцамі. Яны ж – асноўныя завадатары і арганізатары мясцовых каляндарных абрадаў. Майстэрскае валоданне традыцыйным рэпертуарам спалучаецца ў іх з чароўным, часам даведзеным да абсалюта, выкананнем. Выканальніцкі стыль гэтага калектыва ў яркай форме перадае культуру співаў усходнепалескіх беларусаў», – пісалі пра стаўбунскія спеўныя гурты яшчэ ў 1980-х гг. у анатацыі да дыску «Каляндарныя песні Беларускага Палесся: Са збораў фанаграм-архіва Пушкінскага дома» савецкай фірмы грамзапісу «Мелодыя» санкт-пецярбургскія этнографы Л. Пярова і Ю. Марчанка [2, с. 11].



Малюнак 8 – Удзельніцы гурта «Стаўбунскія вячоркі», а таксама лідэр гурта С. Парашчанка на жніве. Стаўбун, 2017



Малюнак 9 – Э. Дарашэвіч (стаіць 1-шы злева) на 30-годдзі гурта «Стаўбунскія вячоркі», 2013

Энгельс Канстанцінавіч быў выключным прафесіяналам у сваёй сферы і меў глыбокія веды ў шматлікіх галінах навукі, да яго заўсёды можна было звярнуцца за парадай і рэкамендацыямі. Я вельмі ўдзячная, што мне пашчасціла атрымліваць кансультацыі і «ініцыяцыю ў рамяство» ў аднаго з заснавальнікаў беларускай культуралогіі і культурнай антрапалогіі (у напрамку якой перадусім дзякуючы яму, а таксама яго каляжанцы З. Мажэйка, рухаецца айчынная практычная фалькларыстыка ХХІ ст.) – навукі, якая адвабленa, цвяроза, без шавіністычных і ідэялагічных «лейцаў» вывучае людзей і грамадствы, якія вакол нас.

Яго парады па арганізацыі палявой працы антраполагаў дапамаглі мне падчас збору матэрыялаў па вясельнай абраднасці майго роднага Заходняга Палесся для дыпломнай працы як выпускніцы кафедры этналогіі БДУКМ, а потым і для магістарскай ды кандыдацкай дысертацыі ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі. Ён лічыў, што менавіта палявая праца дазваляе фалькларысту атрымаць кваліфікацыю сапраўднага спецыяліста, і асаблівую ўвагу ён надаваў моманту ўзнікнення кантакту паміж даследчыкам і носьбітам культуры: «Калі няма кантакта з носьбітамі – няма якасных і навукова карысных вынікаў даследавання. Каб быць прынятымі ў асяродку людзей – аб’ектаў вывучэння, мы павіны наладзіць добрыя адносіны з імі. Даследчыкі павінны быць пільнымі пры выкарыстанні сабранай інфармацыі і сачыць, каб вынікамі даследаванняў маглі карыстацца і навукоўцы, і людзі, якіх яны вывучалі» [1, с. 28].

Разам з маімі былымі калежанкамі па курсе, якія (усе да адной) абралі кар’еру даследчыка (пасля магістратуры сталі аспірантамі НАН Беларусі) мы сардэчна ўдзячныя Э. Дарашэвічу за вельмі выніковую «фармоўку» (сапраўдную ініцыяцыю) нас у здольнасці не толькі *слухаць* і *глядзець* на носьбітаў традыцыйнай культуры, а *ч у ц ь* і *б а ч ы ц ь* іх (як асоб, выбітных майстроў мастацтва вуснай традыцыі, а галоўнае – гарантаў аховы спадчыны, якая ратуе і беларусаў, і чалавецтва ўвогуле ад пераўтварэння ў прымітыўных біяробатаў эпохі кансюмерызму).

**Спіс літаратуры:**

1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Энгельс Дарашэвіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с. : іл.
2. Калацэй, В. Лінія жыцця / Вячаслаў Калацэй // Настаўніцкая газета, 2013. – 28 лютага. – № 21. – С. 11.
3. Культурная спадчына: Культуралагічна-сацыялагічныя даследаванні / Э. Дарашэвіч, Ул. Конан і інш.; уклад, нав. рэд. і аўт. прадм. – праф. Э. Дарашэвіч – Мінск : ВТАА «Сучаснае слова», 2001. – 168 с.
4. Masterpieces of the Oral and Intangible Heritage of Humanity. Proclamations 2001, 2003 and 2005 / chief editor Rieks Smeets. – Gand : Snoeck-Ducaju & Zoon. – 107 p.

***Вольга Кулікова***

**ГУМАНІСТЫЧНЫЯ АСНОВЫ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ *(памяці прафесара Э. Дарашевіча)***

*У артыкуле разглядаецца феномен гуманістычных асноў беларускай нацыянальнай культуры, на які адным з першых звярнуў увагу Э. Дарашэвіч. Сінтэз хрысціянскай духоўнасці, антычнай мастацкай міфалогіі і аўтахтоннай фальклорнай традыцыі ў XIX ст. стаў фундаментам адраджэння беларускай культуры (найперш літаратуры), а ў пач. XX ст. гуманізм мастацкай культуры Беларусі набыў новыя рысы і можа быць ахарактарызаваны як перыяд класічнага народнага гуманізму.*

***Olga Kulikova***

**HUMANISTIC FUNDAMENTALS OF THE BELARUSIAN NATIONAL CULTURE (*memory of joint work with the scientific adviser E. Darashevich*)**

*This article examines the phenomenon of humanistic foundations of the Belarusian culture, which was one of the first to draw the attention of the author's supervisor – professor E. Darashevich. According to the author, the synthesis of Christian spirituality, ancient artistic mythology and indigenous folk tradition, already in the nineteenth century. became the foundation of the revival of Belarusian culture (especially literature), and in the beginning. XX century the humanism of the artistic culture of Belarus acquires a new character, which can be characterized as a period of classical folk humanism.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цягам апошніх дваццаці гадоў разам з прафесарам Энгельсам Дарашэвічам і пад яго кіраўніцтвам аўтар вывучала генезіс гуманістычнага ў этнічнай беларускай культуры, а таксама – і сёння (страціўшы кіраўніка, але, не забыўшыся на яго ўказанні і парады) працягвае весці пошук гуманістычных асноў беларускай нацыянальнай культуры.

У золаку свайго жыцця (гады працы ў БДУКіМ), паглыбляючыся ў традыцыйную культуру беларусаў, Э. Дарашэвіч у фундаментальнай манаграфіі «Тэорыя фальклору» сістэматызаваў, абагульніў і аналітычна замацаваў гуманістычны складнік свядомасці і паводзін беларусаў. На падставе вывучэння культуры Еўропы і свету ён, як і іншыя навукоўцы, сцвярджае, што «фальклор – праграмная аснова ўсёй гуманістычна зарыентаванай сусветнай мастацкай культуры, крыніца асобных нацыянальных мастацкіх традыцый, увасабленне самасвядомасці народаў» [2, с. 11–12]. Паводле яго перакананняў, нацыянальны фальклор – асноўная крыніца беларускай культуры як статыстычна дамінуючы дэмакратычны выразнік глыбіннага светапогляду людзей (самой ідэі ўспрымання такіх канстант р э н е с а н с н а г а еўрапейскага г у м а н і з м у, як *чалавек, дабрыня, людскасць, родная зямля, адвечная неўміручая ды самааднаўляючаяся штогод прырода*).

Беларуская культура з моманту свайго ўзнікнення і да цяперашняга часу прайшла праз розныя этапы развіцця, праз складанасці і цяжкасці, але не толькі захавала высокую духоўнасць, але і прымножыла яе. Адштурхнуўшыся ад рэнесанснага (як і ў іншых сучасных нацый Еўропы) генезісу, у ⅔ XIX–пач. XX стст. беларуская культура займела знакавы перыяд. Нягледзячы (а магчыма і абумоўлена) знешнім уціскам з захаду і ўсходу, гэта – несумненна перыяд станаўлення беларускай нацыянальнай культуры. Адзначым, што ў XIX–пач. XX стст. (класічны перыяд) адбываецца беспрэцэдэнтны навуковы факт – дакументальная фіксацыя беларускай культуры, у тым ліку і фальклору, як асобных відаў народнай мастацкай культуры – культуры, маркіраванай этнонімам «беларусы» (раней дамінавалі этнонімы «русіны», «ліцвіны»). Збіральнікі XIX–пач. XX стст. назапасілі багаты фактычны матэрыял, які дазваляе сцвярджаць, што асаблівасці беларускай культуры, як у асноўным народнай культуры, якая развівалася пераважна ў народных нетрах, абумоўліваюць яе гуманістычны характар. У. Конан, які даследаваў «генетычна-этнаграфічнае ядро» беларускай культуры, піша, што «беларусы захаваліся ў жыццяздольным стане, дзякуючы "выключанасці" вясковага народа з сістэмы пануючых іншанацыянальных культур. Яно стала быццйнай, анталагічнай асновай адраджэння нацыянальнай культуры» [4, с. 31].

Да XIX ст. беларускае сялянства існавала ў патыярхальных умовах натуральнай гаспадаркі, аддаленае (у параўнанні з гараджанамі і шляхтай) ад палітычных уплываў, і, бадай у поўнай недатыкальнасці, захавала сваю мову, звычаі, фальклор. І гэты этнічны пласт – адбітак гуманізму ў народнасці (незабітае з XVII ст. касцёлам, а з канца XVIII ст. царызмам «рэха» брацкіх і рэфармацкіх школ, напісанага селянінам «Баркулабаўскага летапісу» і інш. рэнесансных помнікаў Беларусі). Асаблівасці нашай культуры, як культуры з гуманістычна-рэнесансным народным апірышчам, абумоўліваюць яе гуманістычнасць, якая стабільна праяўляе сябе ў фальклоры, што ўжо ў XIX–XX стст. стаў адной з вядучых крыніц нацыянальнага адраджэння.

Але звернемся да «каранёў». Э. Дарашэвіч быў упэўнены, што рэнесансная гуманістычная традыцыя Беларусі ўвабрала ў сябе дахрысціянскую антычную, мясцовую фальклорную і хрысціянскую плыні. Асновы чалавечнасці, асновы разумення сутнасці чалавека, гуманізму мелі глыбокія карані, пачынаючы з перыяду дахрысціянскага (па-за гістарычнага), калі чалавек усведамляў сябе часткай прыроды, усведамляў сваю залежнасць ад яе. Надалей гэта выяўленне гуманістычнай прыроды этычнага і эстэтычнага ўсведамлення ва многіх старажытных, захаваных да сёння абрадах, павер'ях, прыказках, і праява іх ў беларускім фальклоры (як адным з найбагатых у Еўропе) не магло не адбіцца ў нацыянальным прафесійным мастацтве (літаратуры, выяўленчым мастацтве і інш.), навуцы (філасофіі, этнамузыкалогіі, этнакінематаграфіі і г. д.).

Даследаванні сусветнага фальклору паказваюць што большасць яго жанраў канцэптуальна прымеркавана да пэўных абрадаў − каляндарных, сямейных, рэлігійных. Наш фальклор тут – не выключэнне, а аргумент. І гэтую канцэптуальную цэласнасць беларускага фальклору з захаванасцю ў ім устойлівага ядра каляндарнага і сямейна-родавага цыклу [7, с. 98–99] раскрыла калежанка Э. Дарашэвіча па НАН Беларусі слынны этнамузыколаг і этнакінематаграфіст Зінаіда Мажэйка ў сваёй манаграфіі «Экология традиционной народно-музыкальной культуры : нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем» [7]. Даследчыца традыцыйнай народна-музычнай творчасці беларусаў, шэраг кніг якой рэцэнзаваў Э. Дарашэвіч, фіксуе, што «песни календарного круга являются своего рода ядром традиционного фольклора» [7, с. 22], што «календарно-песенный фольклор в Беларуси… в наибольшей мере сохранён» [7, с. 98–99].

Так, фальклор, які «здымае» непасрэднае, недыферэнцыраванае адзінства быцця і культуры міфалагічнай эпохі, стварае самабытны свет мастацтва, якое развіваецца па сваіх спецыфічных эстэтычных канонах, выкарыстоўваў міфалагічныя і абрадавыя сюжэты, вобразы і матывы, але па-мастацку пераўтвараў іх, надаваў ім сэнс мастацкай каштоўнасці. Напрыклад, міфалагічнае ўсведамленне, звязваючы чалавека і прыроду, у фальклоры набывае іншае гучанне, сімвалічнае галасавое ўспрыманне стану прыроды. З. Мажэйка адзначае: «Свойственное песенному календарю единение с природой переакцентируется в эту пору с весенне-летнего экстровертного одухотворения голосом фоносферы (с символикой вдохновенно-таинственной "малай ночы купальскай") на интровертное "голосовое погружение" в соответствии с состоянием осенней природы (с символикой отчужденно-тёмной "доўгай ночы асенняй")» [7, с. 31].

Абрады выконваюць функцыю своеасаблівых «генератараў» фальклору − народных песень, прыпевак, частушак, казак, легенд, прыказак, прымавак, народнага тэатра, карнавалу [6, с. 24]. Але развіцце ішло, і «найчасцей тыя сюжэты, вобразы і матывы, якія ў язычніцкай міфалогіі мелі сур'ёзнае значэнне ў якасці аб'ектаў веры, у фальклоры (народнай казцы, легендзе, песні) набылі значэнне метафары, сімвала, а нярэдка яшчэ пераасэнсаванае ў гратэскавым свеце». Гэты карнавальна-гратэскавы аспект беларускага фальклору даследуецца ў манаграфіі У. Конана «Ля вытокаў самапазнання» [3].

Аналізуючы ўспрыманне беларусамі адвечнай, бясконцай і перыядычна самааднаўляемай прыроды, гэты аспект адзначае і З. Мажэйка: «Вместе с тем, как и на коляду (в период зимнего солнцеворота), на купалу (в период летнего солнцеворота) в полной мере дает о себе знать карнавальность мироощущения «песенной общины». Распространенная в народе поговорка «На купала, что сделал – то пропало» прямо перекликается с действиями шиворот-навыворот» в колядные кривые вечера. Карнавализованные народные празднества – и сейчас живая традиция» [7, с. 29].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Генезіс фальклору не адмяняе міфалогіі. Больш за тое, яна «застаецца яго крыніцай і «будаўнічым матэрыялам», хоць і страчвае значную частку сваіх светапоглядных і нарматыўных функцый, паступова рэдуцыруецца ў спецыфічна эстэтычныя формы культуры» [5, с. 56]. Гэта глыбокая архаічнасць культурных перажыванняў з'яўляецца сутнаснай і адметнай рысай беларускага фальклору.

Яшчэ адна з асноў гуманізму беларускай культуры – сінтэз хрысціянскай духоўнасці і старадаўняй мастацкай міфалогіі. Прычыны гэтай трываласці і жыццёвасці язычніцкіх традыцый у Беларусі ў тым, што далучэнне народа да новай рэлігіі адбывалася з асаблівасцямі: пераважна мірным шляхам і расцягнулася ў часе, бадай што, на два стагоддзі. Мела значэнне і сама «танальнасць» хрышчэння продкаў беларусаў, у адрозненне ад прымусовага, так бы мовіць, «рэвалюцыйнага» хрышчэння Кіеўскага княства.

З прыняццем хрысціянства адбывалася «мірная канвергенцыя» дзвюх ментальнасцей – самабытнай народнай, язычніцкай і хрысціянскай, прыўнесенай з элiністычнай Візантыі [5, с. 52].

Гэты сінтэз знайшоў адлюстраванне ў народнай культуры, дэманструецца ў фіксацыі беларускага фальклору ў XIX ст. Хрысціянская духоўнасць, якая сцвярджае любоў да бліжняга праз любоў да Бога ўзвышае чалавека духоўна, яго чалавечыя якасці, мірыцца з прыроднай сутнасцю чалавека. У сваім даследаванні З. Мажэйка адзначае: «Будучи древнейшими песнями языческих празднеств наступления “великих солнечных дней”, волочебные песни с распространением христианства были приспособлены церковниками к первому дню пасхи, которая в Беларуси также называется “великдень”. Историческая жизнь обходных волочебных песен аналогична, таким образом, языческим колядкам (тоже приспособленным церковниками к рождеству), с которыми эти песни близко родственны по назначению (обходы дворов), содержанию (празднично-поздравительному) и структурно-стилевым признакам» [7, с. 26–27]. Яшчэ адзін прыклад, звязаны з юр'еўскім і троіцкім (з зававяршаючай «русальнай нядзеляй») святамі: «Внешне приспособленные к более поздним христианским святцам, они развертывают по существу связанные с анимистическим культом растений элементы древней дохристианской обрядности, обусловленные “мирослышанием” живущего в гармонии с природой традиционалистского общества» [7, с. 27].

Значным перыядам ў развіцці беларускай культуры з'яўляецца 2/2 XIX–пач. XX стст. – перыяд станаўлення беларускай нацыянальнай культуры, калі сінтэз хрысціянскай духоўнасці і старадаўняй мастацкай міфалогіі, фальклорнай традыцыі стаў фундаментам яе адраджэння (XIX ст. – перадкласічны перыяд развіцця беларускай культуры, найперш літаратуры, як народнай). Пагодзімся з У. Гніламедавым: «Гэта сапраўдны цуд, што не знікла Беларусь – як народ, як краіна… Гэты цуд у многім забяспечыла – …беларуская літаратура, якая адыграла ролю носьбіта нацыянальнага генетычнага кода, нацыянальнай генетычнай памяці. Яна, як правіла, выступала носьбітам такіх універсальных гуманістычных паняццяў, як сумленне, праўда, справядлівасць, высакароднасць, годнасць» [1, с. 131].

Так, гуманістычная традыцыя найперш прасочваецца ў беларускай літаратуры. Аснову беларускай літаратуры 2/2 XIX–пач. XX стст. склалі ідэі, якія садзейнічалі служэнню народу. У гэтым бачылі сэнс свайго жыцця лепшыя прадстаўнікі новай беларускай літаратуры. Яны ішлі па шляху маральнага пошуку, паказаўшы чалавека, які з'яўляецца захавальнікам народнай маральнасці, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей.

Безумоўна, у беларускай літаратуры склаліся высокія гуманістычныя традыцыі: любоў да чалавека, павага да вынікаў яго працы, адлюстраванне яго імкненняў да сацыяльнай справядлівасці і свабоды, «літаратура аб'ядноўвала народ на глебе духоўнай блізкасці, высокіх маральна-сацыяльных каштоўнасцей і запатрабаванняў» [1, с. 131].

Гуманізм мастацкай культуры Беларусі пач. XX ст., у прыватнасці літаратуры, працягваючы традыцыі XIX ст., набывае новы характар. Ён з'яўляецца перыядам класічнага народнага гуманізму, які знайшоў больш яркае адлюстраванне ў творах Я. Коласа і Я. Купалы і інш. Класічны перыяд вельмі важкі, так як з'яўляецца ўзорам для разумення гуманістычных народных каранёў. Гуманістычны змест гэтага перыяду становіцца асновай для ўсёй беларускай культуры.

Зварот да гуманістычных традыцый мінулага Беларусі працягваецца і сёння. Гэта дае магчымасць раскрыць іх значэнне для развіцця сучаснай культуры ў духу гуманізму і агульначалавечых каштоўнасцей. Раскрыццё гуманістычных тэндэнцый у культуры Беларусі садзейнічае ўзбагачэнню, напаўняльнасці нацыянальнай культуры.

**Спіс літаратуры:**


1. Гніламёдаў, У. Літаратура. Гісторыя. Свядомасць : гісторыка-літаратурны нарыс / Уладзімір Гніламедаў, Мікола Мікуліч. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 387 с.
2. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору // У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча / уклад. М. Козенка ; навук. рэд. В. Калацэй. – Мінск : выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2011. – С. 10–79.
3. Конан, Ул. Ля вытокаў самапазнання : Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору/Уладзімір Конан. – Мінск : Маст. Літ., 1989. – 238 с.
4. Конан, Ул. Беларускае нацыянальнае Адраджэнне : гісторыка-тыпалагічны аналіз паняцця / Уладзімір Конан // Беларусіка – Albaruthenica I. – Мінск, 1993.
5. Конан, Ул. Міфалогія, фальклор і літаратура ў кантэксце нацыянальнай культурнай традыцыі / Ул. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 4. – С. 47–57.
6. Конан, Ул. Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі / Уладзімір Конан : У 3 т. ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Т. 1. : X ст.−1905 г. − 439 с.
7. Можейко, З. Экология традиционной народно-музыкальной культуры : нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / Зинаида Можейко. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 147 с.



***Паліна Кcourановіч***


## ЭНГЕЛЬС ДАРАШЭВІЧ : «ФАЛЬКЛОР ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁ»


*У артыкуле колішняя вучаніца прафесара Э. Дарашэвіча, пазней – загадчык аддзела музея-ска́нсэна і магістрант НАН Беларусі – робіць спробу асэнсавання складовых разумення фальклору прафесарам Дарашэвічам, а таксама аналізуе метады перадачы гэтага разумення яго студэнтам на дысцыплінах «Тэорыя фальклору» і «Культурная антрапалогія».*





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ